Пятая сесія Вярхоўнага Савета СССР

Прамова дэпутата Ц. Я. Кісялёва

(Баранавіцкая выбарчая акруга, Беларуская ССР)

Таварышы дэпутаты! З неаслабнай увагай, з пачуццём высокага гонару за нашу сацыялістычную Радзіму выслухалі мы даклад кіраўніка нашага Урада Мікіты Сяргеевіча Хрушчова. У гэтым дакладзе намалявана яркая карціна выдатных дасягненняў Савецкай краіны, якія даюць магчымасць распачаць ажыццяўленне новых буйных мер, накіраваных на далейшы ўздым дабрабыту ўсяго савецкага народа. У нашай краіне ўсё робіцца для шчасця чалавека. У гэтым Камуністычная партыя Савецкага Саюза бачыць сваю галоўную задачу.

У дакладзе таварыша М. С. Хрушчова выкладзена прапанова Урада аб адмене падаходнага падатку з заработнай платы рабочых і служачых. Гэтая прапанова вынікае з рашэнняў XXI з'езда КПСС. Адмена падаходнага падатку — найвялікшы па свайму палітычнаму і эканамічнаму значэнню акт Савецкай дзяржавы. Такое мерапрыемства праводзіцца ўпершыню ў гісторыі дзяржаў. Яно магчыма толькі ва ўмовах сацыялістычнага ладу.

Вялікае народнагаспадарчае значэнне мае таксама прапанова Урада аб змяненні маштабу цэн, узбуйненні грашовай адзінкі і замене грошай, якія цяпер абарачаюцца, новымі грашыма. Далейшае ўдасканальванне савецкай грашовай сістэмы — у інтарэсах і дзяржавы, і народа. Правядзенне гэтага важнага мерапрыемства будзе садзейнічаць далейшаму людзей факта, што ўпершыню ў сусветнай гісторыі краіна, якая мае самую магутную зброю, прапануе забараніць яе і ажыццявіць усеагульнае і поўнае раззбраенне. Чалавечы розум, воля народаў падказваюць неабходнасць прыняцця савецкіх прапаноў усімі дзяржавамі.

Праз некалькі дзён спаўняецца пятнаццацігоддзе з дня разгрому гітлераўскай Германіі. Прайшоў вялікі тэрмін, але мірны дагавор з Германіяй да гэтага часу не падпісан. Мы лічым такое становішча зусім ненармальным. Час, нарэшце, ліквідаваць небяспечны ачаг напружанасці ў цэнтры Еўропы.

Урад Адэнауэра стаў на небяспечны і згубны шлях. Як відаць з апошніх выступленняў Адэнауэра, ён не ўяўляе сабе іншай абстаноўкі ў свеце, апрача «халоднай вайны». Наступіўшае пацяпленне ў міжнародных справах кідае яго ў дрыжыкі, нават падумвае аб пераглядзе існуючых граніц паміж дзяржавамі. Але пан канцлер, хоць Вы і западны стары чалавек, але ўсё роўна павінны адчуваць, што палітычнае надвор'е робіць сёння не халодны вецер з Усходу. Бонскія рэваншысты падумваюць у першую чаргу паглынуць Германскую Дэмакратычную Рэспубліку, ліквідаваць сацыялістычныя заваёвы двайную ігру. З аднаго боку хочуць заспакоіць грамадскую думку ў сваіх краінах і заяўляюць аб сваёй згодзе на перагаворы. А з другога — працягваюць гонку ўзбраенняў; накопліваюць атамную зброю, ствараюць аб'яднаныя сілы НАТО, заахвочваюць германскі рэваншызм. Прадстаўнікі заходніх дзяржаў выдумваюць усё новыя і новыя цяжкасці, каб не дапусціць падпісання пагаднення аб спыненні выпрабаванняў ядзернай зброі. Асабліва яркая пазіцыя заходніх дзяржаў выявілася на пасяджэннях Камітэта па раззбраенню ў Жэневе. Яны яўна не хочуць раззбройвацца і маюць намер зноў утапіць пытанне аб раззбраенні ў размовах.

Відаць, паўныя колы на Захадзе разлічваюць і ў далейшым ігнараваць волю народаў. Аднак гэта бліз-

[illegible] паслухмянай зброяй [illegible]

[illegible] яны [illegible] ўлягаюць аб [illegible] больш актыўна [illegible] жыцці, [illegible] ўсё [illegible] народаў [illegible] капіталістычных [illegible] велізарных [illegible] ваенных [illegible] Хрушчова [illegible] падпальшчыкам вайны ўсё цяжэй ашукваць іх на-

два разы больш і малака на 37 працэнтаў больш, чым за той жа перыяд 1959 года. Цяпер у рэспубліцы поўным ходам ідуць веснавыя палявыя работы. Працаўнікі калгасаў і саўгасаў прыводзяць у дзеянне раней нявыкарыстаныя рэзервы для павелічэння вытворчасці ўсіх відаў сельскагаспадарчай прадукцыі і выканання прынятых сацыялістычных абавязацельстваў.

Расцвітае жыццё ў гарадах і сёлах рэспублікі. Гэты росквіт — вынік самаадданай працы беларускага народа, вынік неаспрэчных пераваг сацыялістычнага ладу, вынік ажыццяўлення нашай партыяй вялікіх запаветаў У. І. Леніна.

У адказ на новае праяўленне бацькоўскіх клопатаў Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада аб няспынным росце дабрабыту савецкага народа працоўныя Беларусі яшчэ шырэй разгорнуць сацыялістычнае спаборніцтва, забяспечаць датэрміновае выкананне сямігодкі і тым самым унясуць свой уклад у агульнанародную справу барацьбы за мір, за камунізм. **(Апладысменты).**

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Вышэйшы прынцып знешняй палітыкі Савецкага Саюза — гэта забеспячэнне міру і бяспекі ўсіх народаў. Гэтаму падпарадкавана ўся практычная дзейнасць нашага Урада ў галіне знешняй палітыкі. Гэтай мэце былі падпарадкаваны гістарычныя візіты Мікіты Сяргеевіча Хрушчова ў зарубежныя краіны. Разам з намі ўсе людзі зямнога шара, якія імкнуцца да спынення «халоднай вайны» і ўстанаўлення трывалага міру, аднадушна і горача адабраюць вынікі паездак М. С. Хрушчова ў ЗША, у краіны Азіі і ў Францыю. У тым, што за апошні час адбылася пэўная разрадка міжнароднай напружанасці і міжнароднае становішча палепшылася,—велізарная заслуга нашай краіны, нашага Урада, узначальваемага М. С. Хрушчовым.

Працоўныя Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі разам з усім савецкім народам аднадушна адабраюць знешнюю палітыку нашага Урада і бясконца ўдзячны Мікіту Сяргеевічу Хрушчову за яго нястомную дзейнасць у імя міру і дружбы паміж народамі ўсіх краін. **(Апладысменты).**

Намаганнямі міралюбівых дзяржаў і, у першую чаргу, Савецкага Саюза, барацьба народных мас усяго свету прынесла свае вынікі: у міжнародных адносінах намеціліся зрухі ў лепшы бок. Аднак народы не могуць задаволіцца гэтым. Цяпер справа за тым, каб ператварыць разрадку, якая намецілася, у працяглы і трывалы мір. Для гэтага трэба, як прапануе Савецкі Ўрад, вырашыць тыя канкрэтныя пытанні сусветнай палітыкі, якія ствараюць напружанасць у адносінах паміж дзяржавамі. Народы ўсяго свету чакаюць станоўчага вырашэння такіх надзённых пытанняў, як пытанні аб поўным і ўсеагульным раззбраенні, аб заключэнні мірнага дагавору з Германіяй, уключаючы пытанне аб стварэнні вольнага горада Заходні Берлін, аб забароне выпрабаванняў атамнай і вадароднай зброі.

Самая важная міжнародная праблема — гэта праблема ўсеагульнага і поўнага раззбраення. Безразважная гонка ўзбраенняў, у якую ўвергнут свет, тоіць у сабе страшэнную небяспеку новай, самай разбуральнай і смертаноснай вайны. Ажыццяўленне праграмы ўсеагульнага і поўнага раззбраення, якую ад імя Савецкага Ўрада выставіў з трыбуны Арганізацыі Аб'яднаных Нацый Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў і якая сустрэла гарачае адабрэнне ўсіх міралюбівых народаў, прынесла б велізарныя выгады ўсяму чалавецтву, адкрыла б шлях да трывалага міру і шпаркага развіцця эканомікі і культуры ўсіх краін, усіх народаў.

Ніхто і нішто не можа зацямніць таго яснага і зразумелага для ўсіх

ваць пяжкія вынікі фашысцкай акупацыі. Пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі і Савецкага Ўрада, пры братняй дапамозе ўсіх народаў СССР, і перш за ўсё вялікага рускага народа, у рэспубліцы за гранічна кароткі тэрмін адноўлена разбураная ворагам гаспадарка і дасягнуты буйныя поспехі ў развіцці прамысловасці, сельскай гаспадаркі, навукі і культуры, у павышэнні матэрыяльнага дабрабыту працоўных. У цяперашні час Беларусь вырабляе прадукцыі амаль у 4 разы больш, чым да вайны.

Аднак глыбокія раны ў сэрцах беларускага народа засталіся да гэтага часу. Тысячы сем'яў назаўсёды страцілі сваіх бацькоў, маці, братоў і сясцёр.

І цяпер, калі германскія рэваншысты атрымліваюць у свае рукі атамную і ракетную зброю, мы не можам быць абыякавымі да гэтага. Смертаносная зброя даецца ў рукі тым самым гітлераўскім генералам, якія ўсяго толькі пятнаццаць год назад разбойнічалі ў Беларусі, як і ў многіх краінах Еўропы.

Вось чаму заключэнне мірнага дагавору з Германіяй, урэгуляванне пытання аб Заходнім Берліне з'яўляецца неадкладнай справай, якая павінна быць вырашана ў інтарэсах міру і бяспекі народаў.

Працоўныя Беларусі не кіруюцца пачуццём помсты і варожасці і, як усе савецкія народы, хочуць жыць у міры і дружбе з нямецкім народам.

Мы горача адабраем і падтрымліваем ініцыятыву нашага Урада ў пытанні аб заключэнні мірнага дагавору з Германіяй, уключаючы нармалізацыю становішча ў Заходнім Берліне. Працоўныя Беларусі падтрымліваюць прапанову кіраўніка нашага Урада аб тым, каб у выпадку, калі не ўдасца заключыць мірны дагавор з дзвюма германскімі дзяржавамі, заключыць яго з Германскай Дэмакратычнай Рэспублікай.

Мы з велізарным задавальненнем адзначаем, што як па германскаму, так і па ўсіх іншых карэнных пытаннях міжнароднай палітыкі пазіцыя Савецкага Ўрада ясная і акрэсленая. Яна поўнасцю адпавядае жыццёвым інтарэсам нашага народа. У той жа час яна адпавядае інтарэсам народаў усяго свету, інтарэсам далейшай разрадкі міжнароднай напружанасці.

Як неаднаразова заяўляў кіраўнік нашага Урада таварыш М. С. Хрушчоў, Савецкі Саюз ідзе на нараду ў Парыжы з самымі шчырымі намерамі—не толькі садзейнічаць агульнаму аздараўленню міжнароднай абстаноўкі, але і зрабіць усё для таго, каб дасягнуць узаемаразумення з кіраўнікамі дзяржаў і Урадаў заходніх дзяржаў, прасунуць уперад вырашэнне неадкладных пытанняў.

Справа цяпер за заходнімі дзяржавамі. Ствараецца, аднак, уражанне, што сёй-той на Захадзе вядзе

Няхай ведаюць тыя, хто адважыцца парушыць свяшчэнныя граніцы нашай Радзімы, што ў савецкага народа ёсць усё неабходнае для таго, каб правучыць ахвотнікаў да ўсялякіх правакацый!

Савецкія людзі асабліва абураны гэтым агрэсіўным актам амерыканскай ваеншчыны пасля таго, як народы ЗША так цёпла прымалі кіраўніка Савецкай дзяржавы, а прэзідэнт Эйзенхауэр заяўляў аб сваім міралюбстве. Мы спадзяёмся, што амерыканскі народ разам з намі асудзіць гэтыя вераломныя дзеянні—і правакацыям у адносінах да Савецкага Саюза будзе пакладзен канец. Гэты факт яшчэ раз паказвае, што неабходна высока трымаць пільнасць у адносінах да падкопаў ворагаў міру. Вось чаму мы лічым абсалютна правільнай дзейнасць нашага Урада па ўмацаванню абароназдольнасці краіны, па аснашчэнню Узброеных Сіл самай магутнай сучаснай зброяй. Да таго часу, пакуль не будзе дасягнута пагадненне аб раззбраенні, наша Савецкая Армія, як зусім правільна сказаў Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў, павінна мець лепшую ў свеце зброю і ў колькасці, неабходнай для таго, каб нанесці сакрушальны ўдар па агрэсарах, калі яны агаляць меч супраць краіны Саветаў або супраць іншых сацыялістычных краін.

Таварышы дэпутаты! Ва ўсіх савецкіх людзей выклікае пачуццё законнай гордасці той факт, што наша краіна з'яўляецца сцяганосцам міру, а кіраўнік Савецкага Ўрада Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў сваім беззаветным служэннем справе міру і дружбы паміж народамі здабыў сабе глыбокую павагу ўсіх простых людзей свету. Працоўныя Беларусі жадаюць Вам, Мікіта Сяргеевіч, поспехаў у Вашай высакароднай місіі і на маючай адбыцца нарадзе ў вярхах. Вы, Мікіта Сяргеевіч, будзеце прадстаўляць не толькі 212 мільёнаў савецкіх людзей, але і сотні мільёнаў актыўных барацьбітоў за мір на ўсім зямным шары.

Цяпер у нашай рэспубліцы шырока разгарнулася сацыялістычнае спаборніцтва за датэрміновае выкананне сямігодкі. І поспехі ў гэтым у нас значныя. План прамысловай вытворчасці як за мінулы год, так і за чатыры месяцы гэтага года выканан датэрмінова. У першым годзе сямігодкі аб'ём прамысловай вытворчасці ўзрос на 12 працэнтаў замест 7 працэнтаў, прадугледжаных планам. За чатыры месяцы гэтага года аб'ём прамысловай вытворчасці павялічыўся больш чым на 7 працэнтаў у параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года. Выконваюцца заданні па прадукцыйнасці працы і іншых паказчыках.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ